Пролетарыі ўсіх краін, аднайцеся!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 172 (244) | Чацвер 1 жніўня 1940 г. | Цана 10 кап.

Прыезд у Маскву пасланцоў працоўных Бесарабіі і Паўночнай Буковіны

30 ліпеня ў Маскву прыбыла делегацыя працоўных Бесарабіі і Паўночнай Буковіны.

На перроне Кіеўскага вакзала делегацыю сустракалі кіраўнікі Маскоўскай партыйнай арганізацыі, Героі Совецкага Саюза, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, знатныя стаханаўцы і прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Ля ўваходу на вакзал адбыўся мітынг. Яго адкрывае кароткай уступнай прамовай сакратар Маскоўскага абласнога камітэта партыі Чернаусаў.

Ля мікрафона стаханавец завода імені Гарбунова Сероў. Ён перадае пасланцам працоўных Совецкай Бесарабіі і Совецкай Буковіны палкае прывітанне працоўных сталіцы.

Слова прадастаўляецца делегату працоўных у сталіцу вялікага Совецкага Саюза батраку Кірылюку.

— Дарагія таварышы! — гаворыць Кірылюк, — мы шчаслівы вітаць вас ад імені вызваленых народаў Бесарабіі і Паўночнай Буковіны на векі скінуўшых аковы навольніцтва! Рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя ў цяжкія гады свавольства і прыгнёту звярталі свае позіркі да чырвонай Масквы.

Цяпер мы атрымалі доўгачаканую свабоду, — пад доўгаанезмаўкаючыя апладысменты заканчвае [illegible]

Мітынг закончан. Делегаты сходзяць з трыбуны і ўсаджваюцца ў аўтамабілі. Увітыя зеленню і кветкамі машыны павольна рухаюцца паміж радоў лікуючых масквічоў.

Міжнародны антываенны дзень

Першага жніўня — дзень пачатку совецкай імперыялістычнай вайны 1914—1918 гг.— працоўныя ўсіх краін праводзяць як дзень барацьбы супроць імперыялістычных войн, супроць капіталізма, за мір, за социялізм.

Вайна — неміцучы спадарожнік капіталізма. На працягу ўсёй сваёй гісторыі капіталістычныя краіны вялі захватніцкія войны, парабашчаючы больш слабыя народы, ператвараючы іх у каланіяльных рабоў.

Грабёж чужых зямель, барацьба за калоніі, за новыя рынкі — аснова непрымірымых супярэчнасцей паміж капіталістычнымі краінамі і прычына многіх войн паміж імі. Супярэчнасці паміж капіталістычнымі краінамі асабліва абвастраюцца ў эпоху імперыялізма, калі ўвесь свет ужо падзелен паміж буйнейшымі імперыялістычнымі драпежнікамі і разгарнулася ўпартая барацьба паміж імі за перадзел свету.

Імперыялістычныя войны ўсім сваім цяжарам узвальваюцца на рабочых і сялян. Усім вядома, якія незлічоныя бедствы прынесла працоўным імперыялістычная вайна 1914—1918 года. У ёй удзельнічалі 33 дзяржавы, насельніцтва якіх складала 1,5 мільярда людзей. 74 мільёны працоўных было пастаўлена пад ружжо. Вайна працягвалася звыш 4 год, і увесь гэты час абільным патокам лілася кроў рабочых і сялян. Звыш 10 мільёнаў чалавек было забіта, 20 мільёнаў пакалечана. Вайна нарадзіла голад, жабрацтва, эпідэміі, якія ўнеслі ў магілу дзесяткі мільёнаў працоўных. Вайна нарадзіла глыбокую разруху, якая, у сваю чаргу, прынесла працоўным новыя бедствы.

Імперыялісты рыхтавалі вайну 1914 г. на працягу многіх год у глыбокай тайне ад працоўных. Калі-ж пачаліся ваенныя дзеянні, яны пачалі ламантаваць аб „абароне бацькаўшчыны". Лозунгам „абароны бацькаўшчыны" буржуазія і яе прыспешнікі з II-га Інтэрнацыянала нагла абманьвалі рабочых і сялян ва ўсіх ваюючых краінах.

[illegible] рабочая партыя, якая ўскрыла сапраўдны сэнс імперыялістычнай вайны, выкрыла яе падпальшчыкаў і ўказала працоўным шлях барацьбы супроць імперыялістычных войн, была партыя большэвікоў. Каб назаўсёды пакончыць з войнамі, вучыў таварыш Ленін, трэба пакончыць з капіталізмам. „Ператварыць вайну імперыялістычную ў вайну грамадзянскую", гэта значыць павярнуць зброю, знаходзячуюся ў руках рабочых і сялян, супроць буржуазіі і звергнуць яе ўладу — вось лозунг, які несла партыя Леніна-Сталіна ў масы. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў рабочы клас нашай краіны ў 1917 годзе ажыццявіў рэвалюцыйны выхад з імперыялістычнай вайны.

Імперыялісты ўсіх краін і іх прыспешнікі крычалі на ўсіх перакрестках, што вайна 1914 года будзе „апошняй" вайной. Але не прайшло і 2 дзясяткаў год, як імперыялісты зноў пачалі вайну, увяргаючы народы ў новыя бедствы.

Тры годы таму назад пачалася вайна Японіі супроць Кітая. У 1939 годзе пачалася вайна Англіі і Францыі супроць Германіі. У гэтыя несправядлівыя грабяжніцкія войны імперыялісты ўцягнулі больш паловы насельніцтва зямнога шара. Нагла абманьваючы народ ліцамернымі лозунгамі „барацьбы" за „свабоду", „дэмакратыю", у сапраўднасці імперыялісты пачалі вайну з-за калоній, за совецкае папаванне, за крыніцы сыравіны і рынкі збыту.

Адзінай краінай, якая вядзе паслядоўную барацьбу супроць імперыялістычнай вайны, з'яўляецца наша магутная социялістычная радзіма — СССР. Працоўныя ўсіх краін, усё перадавое чалавецтва бачаць у СССР чэснага змагара за мір.

Нястрымная стала цяга да Совецкага Саюза. За час з 17 верасня 1939 года на заходніх украінах нашай социялістычнай радзімы адбыліся вялікія гістарычныя справы. Народы заходніх абласцей Украіны і Беларусі, Бесарабіі, Паўночнай Буковіны і Прыбалтыкі ўзялі свой лёс ва ўласныя рукі і павялічылі сям'ю совецкіх народаў. Расце Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік, мацнее яго сіла!

Совецкія людзі павінны з дня на дзень павышаць сваю пільнасць, сваю мабілізацыйную гатоўнасць, умацоўваць абаропаздольнасць совецкай дзяржавы, умацоўваць Чырвоную Армію і Чырвоны Флот, як магутную апору міру[illegible] палітыкі Совецкага Саюза.

[illegible] усямерны рост [illegible] пачатаць, што Совецкага Саюза і ўмацаванне яго міжнароднага аўтарытэта з'яўляюцца не толькі свяшчэнным абавязкам совецкіх людзей, але і адпавядаюць глыбокім інтарэсам усіх народаў, якія хочуць міру і хутчэйшага сканчэння імперыялістычнай вайны. Мы павінны ўсямерна ўмацоўваць нашу магутную дзяржаву, як апору працоўных усяго свету ў іх барацьбе за мір, за шчасце народаў, за поўнае вызваленне ад капіталізма.

Чаму не падрыхтаваны склады?

Уборка азімых і ранніх яравых па Ружанскаму раёну ўжо заканчваецца. Калгаснікі і аднаасобнікі прыступілі да здачы збожжа дзяржаве. Так, калгасы імені Сталіна і імені Молатава 27 ліпеня здалі 121 цэнтнер хлебапастаўкі.

Але дрэнна, што яшчэ да гэтага часу адрамантаван толькі адзін склад, замест неабходных трох, у якім яшчэ адсутнічаюць прылады і інструмент для лабараторыі і абслугоўваючы персанал, як лаборант, візіроўшчык і іншыя. Не абсталяван таксама і пакой для культурнага адпачынку сялян.

Гэта атрымалася таму, што абласная кантора Заготзярно не паклапацілася аб тым, каб своечасова забяспечыць раён складамі. У раёне ёсць адзін склад, але ён умяшчае толькі 6 тысяч цэнтнераў збожжа, а Ружанскі раён павінен здаць дзяржаве 17619 цэнтнераў. Паўстае пытанне: куды будуць ссыпаць астатні хлеб?

М. Гамбург.

Дапамагаем бядняцкім гаспадаркам

Высокаўская машына-трактарная станцыя аказвае вялікую дапамогу бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам вёскі Волькавічы ў апрацоўцы іх зямлі. Нядаўна на іх палях працаваў трактар „У—2" па падняццю папараў. Трактарысты таварышы Паўлюкоў і Белякоў выконвалі норму на ворыве на 250—300 процантаў. Работа трактарыстаў ўсімі сялянамі прынята з ацэнкай „выдатна". Сяляне гэтай вёскі прасілі дырэкцыю машына-трактарнай станцыі дапамагчы ім падняць зяблёва.

А. М. Вайцбнак,
старшы агранам
Высокаўскай МТС

Новы калгас імені Варашылава

Антопаль. Добра пераканаўшыся ў тым, што калгасны шлях з'яўляецца адзіна правільным шляхам да заможнага і культурнага жыцця, 24 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадаркі вёскі Залессе, Дзеткаўскага сельсовета, аб'ядналіся ў калгас. На [illegible] агульным сходзе яны назвалі свой [illegible] іменем таварыша Варашылава.

Новаму калгасу з былога памешчыцкага маёнтка перадана 32 галавы буйнай рагатай жывёлы, а таксама 40 гектараў азімых пасеваў. Маладыя калгаснікі дружна прыступілі да ўборкі ўраджаю.

М. Камарскі.

Першы дзень на малацьбе

Невялікая пляцоўка, расчышчаная прама на полі, замяняе калгасны ток. Тут устаноўлена малатарня „МК—1100". Крыху воддаль стаіць трактар. Зроблены апошнія прыгатаванні да малацьбы. Калгаснікі, вызначаныя на малацьбу, сталі па сваіх мясцах. У чаканні пакуль пад'едуць першыя падводы са снапамі, яны вядуць паміж сабой гутарку аб прадстаячай рабоце на малацьбе, выказваюць свае захапленні новай малатарняй.

— Такую малатарню мы бачым упершыню,—гаворыць калгасніца Феадосія Вірчык. — Пры ўладзе польскіх паноў мы аб такіх машынах нават і не марылі. Малацілі сваё збожжа ўручную, цапамі. Праца была цяжкая, прадукцыйнасць нізкая...

Вось да малатарні адна за адной пад'язджаюць падводы, нагружаныя снапамі жыта. Заракатаў мотор трактара. Рокат трактара дапаўняецца прыглушаным гулам барабана малатарні. Распачалася кіпучая работа.

На памосце ля барабана калгасніца — стаханаўка Феадосія Вірчык. Са стала, на якім калгасніцы запяты рэзкай вёзьмаў, збожжа падаецца да яе. Феадосія Вірчык хутка і спрытна накіроўвае яго ў барабан.

Вірчык упершыню стала на такую складаную работу. Але хутка авалодвае тэхнікай падачы снапоў у барабан. Работа ідзе безастановачна. У арганізаванасці калгаснікаў адчуваецца правільная і прадуманая расстаноўка людзей. Няма мітусні, кожны калгаснік ведае сваё месца.

Роўнымі струйкамі сыплецца буйнае зярно ў падвешаныя мяшкі. Ля мяшкоў завіхаецца калгаснік Лукьян Царэшка. Ён бярэ на далонь зярно.

— Выдатная машына, у зярне няма ніводнай смяцінкі, — гаворыць Царэшка, разгортваючы на далоні сухое і буйнае зярно.

— Машына во! - адклікаецца калгаснік Іван Мелішук, падымаючы ўверх вялікі палец правай рукі...

Мяшкі, напоўненыя чыстым, залацістым зярном, адразу-ж адвозяцца ў калгасны свіран. Ад малатарні адвозяцца таксама і салома і акуратна складаецца ў стог. Работа ідзе дружна і арганізавана.

Але оцікае рокат трактара і гул малатарні. З усіх бакоў нясуцца крыкі:

— Што здарылася?

— Чаму сталі?

— Пара на абед, — смеючыся, адказвае на здзіўленні калгаснікаў старшыня калгаса Сцапан Скакун.

— А мы і не заўважылі, як прыйшоў час на абед, —выціраючы пот, кажа калгасніца Таццяна Баглай.

Перапынак. Пара ісці на абед. Але ніхто не разыходзіцца. Поўныя прыемных уражанняў ад першага дня работы на малацьбе, калгаснікі яшчэ і яшчэ раз з вялікай зацікаўленасцю разглядаюць малатарню.

Сакратар райкома партыі тав. Дземішчанка, тут-жа, ля малатарні праводзіць з калгаснікамі гутарку аб устанаўленні совецкай улады ў Літоўскай, Латвійскай і Эстонскай рэспубліках. Калгаснікі аднадушна вітаюць народы Прыбалтыйскіх краін з іх гістарычнай перамогай.

Дружна і арганізавана прайшла работа на малацьбе і пасля абеду. Вечарам былі падведзены вынікі работы: за дзень намалочана 7024 кілограмы зярна. Радасныя і задаволеныя, з гучнымі песнямі, вярталіся калгаснікі з работы.

Пётр Папок.

Калгас „Вольная праца",
Дамачэўскага раёна.

Мытарствы здатчыкаў

Старанна ўбіраюць свой калгасны ўраджай члены сельскагаспадарчай арцелі „І Мая", Двінскага раёна. Услед за ўборкай збожжа яны арганізавалі малацьбу і выкананне хлебапаставак. 27 ліпеня калгас накіраваў на Кобрынскі пункт Заготзярно першую партыю зярна ў колькасці 508 кілограмаў.

У Кобрынскай лабараторыі зрабілі аналіз зярна. Яно аказа[illegible] прыгодным для здачы. Падводы з збожжа[illegible] былі накіраваны на новы склад. Але [illegible] кіраўнікоў там сустрэлі словамі:

— Збожжа пакуль што не прымаем, не гатоў яшчэ склад. Вязіце на стары склад.

На старым складзе збожжа таксама не прынялі. Калгаснікаў накіравалі ў кантору Заготзярно. З канторы падводы зноў паехалі на новы склад, а з новага склада на стары, і толькі к вечару калгаснікам на элеватары ўдалося здаць зярно.

Так па віне бесклапотных кіраўнікоў Кобрынскай канторы Заготзярно калгаснікам прыйшлося цэлы дзень мытарствацца па гораду. Кіраўнік канторы Заготзярно тав. Маратаў безадказна адносіцца да такой важнейшай дзяржаўнай [illegible] як падрыхтоўка складскіх памяшканняў і арганізацыя прыёмкі зярна новага ўраджаю.

Арасаў.

Першая гадавіна Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі

1 жніўня спаўняецца гадавіна з дня адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, - арганізаванай па ініцыятыве Другога ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў.

Партыя і ўрад паставілі перад выстаўкай адказную і пачесную задачу—стаць арганізатарам магутнага ўздыму социялістычнага спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы і масавага ўнядрэння метадаў работы перадавых гаспадарак, стаханаўцаў, калгасаў, соўгасаў і МТС.

У мінулым годзе ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі былі зацверджаны 46 раёнаў, 268 МТС, 795 соўгасаў, 15.059 калгасаў і 11 004 калгасных фермы. На выстаўцы атрымалі права ўдзельнічаць 150.821 перадавік сельскай гаспадаркі.

Выстаўка — багацейшая скарбніца перадавога стаханаўскага вопыту ў сельскай гаспадарцы, сапраўдны ўсенародны ўніверсітэт. У мінулым годзе яе наведала 3.344.486 чалавек. Вывучэнне матэрыялаў выстаўкі дапаўнялася лекцыямі буйнейшых вучоных нашай краіны, кваліфікаванай кансультацыяй выдаючыхся майстраў социялістычнай сельскай гаспадаркі.

Калгасы, соўгасы, МТС, экскурсанты і экспаненты вярнуліся актыўнымі прапагандыстамі перадавога вопыту. У рэзультаце работы выстаўкі разам[illegible] арганізацыя [illegible] высокай ураджайнасці зернавых. У Свярдлоўскай вобласці, напрыклад, іх налічваецца чатыры тысячы.

Шырэй распаўсюджваецца рух стопудавікоў. У адной Днепрапятроўскай вобласці 223 калгасы з плошчы 145 тысяч гектараў атрымалі ў мінулым годзе па стопудоў зернавых з гектара.

Выстаўка з'явілася арганізатарам барацьбы за выкананне гістарычнага рашэння Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) „Аб мерах прыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах". Толькі за 11 месяцаў, з 1 ліпеня мінулага года па 1 чэрвеня гэтага года, у калгасах краіны арганізавана 235 тысяч новых жывёлагадоўчых ферм.

Заклік таварыша Молатава шырэй разгарнуць социялістычнае спаборніцтва на права ўдзелу на выстаўцы 1940 года знайшоў гарачую падтрымку ў краіне. Знікам усенароднага спаборніцтва з'яўляецца [illegible] удзельнікі выст[illegible] года. Да дня адкрыцця 16 мая яе ўдзельніка[illegible] [illegible] сельскай гаспадаркі, [illegible] раёны, [illegible] МТС, [illegible] соўгасы, 1816 [illegible] калгасы і [illegible] жывёлагадоўчых фермы. [illegible] ўдзе[illegible] цэлі[illegible] дзеў[illegible] каз[illegible] обл[illegible] лін[illegible] Каз[illegible] ска[illegible]

За два з паловай месяцы [illegible] ты ў гэтым годзе выстаўку наведала больш двух з паловай мільёна чалавек.

Пачалася падрыхтоўка да выстаўкі будучага года. Па няпоўных даных у социялістычнае спаборніцтва за права ўдзелу ў выстаўцы будучага года ўключылася 2863 раёны.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка ў будучым [illegible] паўнецца новымі тыс[illegible] — пераможцаў у [illegible] спаборніцтве [illegible] яшчэ яркай праграмай [illegible] вялікую сілу калгасн[illegible] [illegible] новыя выдаючыяся [illegible] нашай сельскай гаспадаркі.

(ТАСС).

СССР — несакрушальны аплот міру

26 год назад, у жніўні 1914 года, пачалася першая совецкая імперыялістычная вайна. Зараз па палях Еўропы, Азіі, Афрыкі, на марах і акіянах бушуе пажар другой імперыялістычнай вайны, яшчэ больш грознай, яшчэ больш бязлітаснай. У вайну ўжо ўцягнута больш палавіны насельніцтва зямнога шара.

Толькі наша краіна, якая паўхільна праводзіць палітыку міру, аказалася недатычнай да страшэннага знішчэння народаў, якое ідзе на палях бітв. Дзякуючы рэвалюцыйнай пільнасці і празор[illegible] [illegible] Леніна-Сталіна [illegible] Совецкага Урада [illegible] да гэтага часу [illegible] Совецкага Саюза, [illegible] Сацыялістычных Совецкіх Рэспублік [illegible] мудрай і да [illegible] кабінетнай.

[illegible] у Орыі, у Европе [illegible] новай агрэсіі супроць Совецкага Саюза. Марнеі англійскай [illegible] на ўказанне [illegible] Гітлера [illegible] Вейган, фашысцкі [illegible] Мар[illegible] [illegible] Сеі[illegible]

[illegible] зброяй гэтай агрэсіўнай палітыкі супроць СССР".

Гісторыя паказала, што наш урад, непрарыўна ўмацоўваючы нашу абаронную магутнасць і знаходзячыся ў стане мабілізацыйнай гатоўнасці, рабіў як раз тое, што неабходна для прадухілення правакацыйнага ўцягнення СССР у вайну. Дакументы, апублікаваныя ў германскай „Белай кнізе", паказваюць, што літаральна ў той самы час, калі глава совецкага ўрада дакладваў Вярхоўнаму Совету аб падазронай вазні на Блізкім Усходзе, [illegible] французкія [illegible] штабы падрыхтоўвалі [illegible] у Орыі, у Европе [illegible] план [illegible] новай агрэсіі супроць Совецкага Саюза. Марнеі англійскай [illegible] на ўказанне [illegible] Гітлера [illegible] Вейган, фашысцкі [illegible] Мар[illegible] [illegible] Сеі[illegible]

[illegible] і калі ў наяўнасці відавочная пагроза нападу на Совецкі Саюз, тады ўзброеныя сілы СССР абрушваюцца на ворага, каб адвесці ўдар і не дапусціць ворага на сваю тэрыторыю.

Словы таварыша Сталіна: „...трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу" — сталі баявым лозунгам, нашай праграмай барацьбы за мір. Ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не застануць нас знянацку.

Закон аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і на 7-гадзінны рабочы дзень, прыняты краінай [illegible] а таксама [illegible] і мужнай [illegible] [illegible] крок да далейшых [illegible] [illegible] і ваенный [illegible] Совецкай дзяржавы.

[illegible] новых [illegible] [illegible] прамысловасці [illegible] гадзін.

[illegible] Перакод на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-гадзінны рабочы дзень — [illegible] совецкага народа працоўным [illegible] чалавецтву да міжнароднага [illegible] дня. Гэтая [illegible] прыняты [illegible] многамільённым совецкім народам, [illegible] [illegible] і [illegible] [illegible] нашу краіну [illegible] [illegible] Краіна социялізма [illegible] [illegible] [illegible]

Партарганізацыя і яе беспартыйны актыў

Сіла, высокі аўтарытэт у масах кожнай партыйнай арганізацыі залежыць ад таго, як гэта партарганізацыя звязана з масамі, як яна прыслухоўваецца к голасу мас, кіруе імі, вядзе іх за сабой.

Комуністы партарганізацыі Брэсцкага водачнага завода правільна зразумелі, што неабходна штодзённа работаць з людзьмі, выхоўваць у іх социялістычныя адносіны да працы, весці агітацыйна-масавую работу, мець сталы [illegible] з якім-бы [illegible] паспяхова [illegible] вытворчасці на за- [illegible] ўлен і за- [illegible] кампаніі СССР і [illegible] калектыў, [illegible] Вялікую [illegible] правялі [illegible] завода па [illegible] 28 і на [illegible] выбарчай [illegible] анізацыя [illegible] татарамі, [illegible] масавую [illegible] выбарчым [illegible] татараў [illegible] да 25. [illegible] вынес [illegible] заводзе [illegible] актыві- [illegible] вых ра- [illegible] алітгра- [illegible] ць. [illegible] форм і [illegible] партарга- [illegible] беспар- [illegible] кую [illegible] ламі ра- [illegible] прыцяг- [illegible] работы. [illegible] ненні па [illegible] ускай і [illegible] умленна [illegible], часта [illegible] ыканаць [illegible] па гра- [illegible] партыйны [illegible] беспар- [illegible] аслухан [illegible] аб вы- [illegible] творчага [illegible] мерцыяна [illegible] водскага [illegible] прыпартый- [illegible] Многія [illegible] ўдзел у [illegible] унеслі [illegible] актыў- [illegible] ца толь- [illegible] нарадах, [illegible] Яна за- [illegible] жывой [illegible] са сваім [illegible] арганізацыі сама [illegible] кожным [illegible] патре-

бах, выслухаць, параіць, а калі патрэба — дапамагчы яму. І таму пры правядзенні любога мерапрыемства партарганізацыя мае добрую апору.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і семідзённы тыдзень, аб мерапрыемствах па барацьбе з прагульшчыкамі і летунамі з'явіўся сур'ёзным стымулам для павышэння прадукцыйнасці працы на заводзе. Пасля мітынга актыў, агітатары атрымалі канкрэтныя ўказанні, як арганізаваць растлумачальную работу сярод рабочых і служачых аб новым законе, як самым практычна дапамагаць паспяховаму правядзенню яго ў жыццё. Гэта задача была паспяхова выканана. Рабочыя з пачуццём глыбокага задавальнення сустрэлі Указ. Яны ацэнілі ганьбой дезарганізатараў вытворчасці. У выніку значна ўмацавалася працоўная дысцыпліна на заводзе. З дня выдання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР на заводзе былі 2 выпадкі спазнення на работу і 1 прагул. Парушальнікі дысцыпліны былі аддаены пад суд і панеслі кару па закону.

Дружна ці арганізавана была праведзена сярод калектыва завода падпіска на пазыку: падпісаліся ўсе 100 процантаў рабочых і служачых завода. Гэта — таксама вынік пладатворнай работы актыва сярод рабочых.

На грамадскай рабоце паўсядзённа растуць і выхоўваюцца новыя кадры. За апошні час з ліку актыва вылучаны больш 10 чалавек на розныя ўчасткі гаспадарчай работы. Так, напрыклад, добры актывіст рабочы т. Безік вылучан інспектарам па якасці. Са сваёй работай ён спраўляецца добра. Рабочы тав. Якімовіч зараз працуе старшынёй заводскага камітэта. Былы чорнарабочы тав. Мазуркевіч загадвае складам і г. д. На 7 чалавек вырасла комсамольская арганізацыя завода. Беспартыйны актыў на вытворчасці займае авангардную ролю, паказвае прыклады работы. Брыгадзір - актывістка, агітатар тав. Дульчэўская Екацерына дабілася таго, што яе брыгада штодзённа выконвае план у сярэднім на 150 процантаў і больш. Соцспаборніцтва ўсё шырэй укараняецца на заводзе. Як вынік на заводзе няма брыгады, якая-б давала менш 100 процантаў сваёй нормы ў дзень.

У сваёй далейшай рабоце з беспартыйным актывам і лагуч з рабочымі партарганізацыя павінна заняцца наладжваннем антырэлігійнай прапаганды і інтэрнацыянальнага выхавання мас, у чым востра адчуваецца патрэба.

Р. Кералёў.

Добрабыт Гайнаўкі

Для культурнага адпачынку працоўных Гайнаўскі гарадскі совет распланіраваў на месцы былой базарнай плошчы, якая знаходзілася ў центры горада, добры парк. Ён займае каля 2 га зямлі. Пасаджана ўжо 300 дрэўцаў, пасеяна трава, зроблены клумбы і газоны. Паўсюды многа кветак. У садзе пабудавана пляцоўка для танцаў, будуць устаноўлены бюсты правадыроў народа таварышоў Леніна і Сталіна.

У раённым центры Гайнаўцы былі крывыя, вузкія вуліцы. Центральная з іх — Комсамольская мела толькі 5 метраў шырыні. Дзве падводы ледзь-ледзь маглі раз'ехацца.

Зараз праводзіцца вялікая работа па ўпарадкаванню горада. Пашыраюцца вуліцы, укладваюцца тратуары, зносяцца пабудовы. Па Комсамольскай вуліцы ўкладваюць новыя тратуары, рамантуецца маставая. Паміж імі засейваюцца траўнікі. Вуліца будзе мець шырыню 15 метраў.

Самаадданасць калгаснікаў

Нядаўна ў лесе, які знаходзіцца недалёка ад калгаса імені Варашылава, Пораззаўскага раёна, узнік пажар. Ён з кожнай мінутай разрастаўся і пагражаў распаўсюдзіцца далей.

Узніклы пажар заўважылі калгаснікі, якія працавалі на полі. Яны пабеглі ў лес і дружна прыступілі да тушэння пажара. Ім на дапамогу падышлі жанчыны вёскі Куклічы. Барацьба з агнём працягвалася каля чатырох гадзін. Пажар быў ліквідаван.

Асаблівы гераізм і самаадданасць пры тушэнні пажару праявілі калгаснікі Міхаіл Брыш, Алексей Гусінец, Осіп Якубовіч, Александр Талай, Осіп Руды і іншыя.

О. Гусінец.

Увекавечанне памяці Олега Дундзіча

Совет Народных Камісараў СССР вынес пастанову аб увекавечанні памяці героя грамадзянскай вайны, камандзіра палка Першай конной арміі Олега Дундзіча. Рашана пабудаваць помнік на магіле героя ў горадзе Роўна, у баях за які ён загінуў.

Камітэт па справах мастацтваў пры Саўнаркоме СССР у бліжэйшы час прыступае да распрацоўкі праекта помніка Олега Дундзічу. (ТАСС).

ХРОНІКА

29 ліпеня ў Маскву прыбылі іранская чыгуначная делег[illegible] для ўдзелу ў сов[illegible] чыгуначн[illegible]

Падрыхтоўка германскага наступлення на Англію

НЬЮ-ЙОРК, 30 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, германскія войскі і ваенныя караблі канцентрыруюцца ў французскіх паўночна-заходніх партах. На ўзбярэжжы акупіраванай часткі Францыі, знаходзячымся супроць Англіі, назіраецца перасоўка германскіх войск. З некаторых раёнаў грамадзянскае насельніцтва эвакуіравана. Немцы перакідваюць войскі і ўзбраенне ноччу. Ва французскія парты перакінуты тарпедныя катэры і эсмінцы.

Англійскія паведамленні аб ваенных дзеяннях у Афрыцы

ЛОНДАН, 30 ліпеня (ТАСС). У афіцыяльным камунікеі з Каіра ўказваецца, што на ўсіх франтах ніякіх наземных аперацый не адбывалася. Паўсюды ідуць дажджы. У камунікеі, перададным з Наіробі гаворыцца: „Нашы паветраныя сілы паблізу Мояле паспяхова бамбардіравалі скапленні варожых войск і караван вярблюдаў".

У другім паведамленні ўказваецца, што 29 ліпеня ў часе налёту італьянскай авіяцыі на Адэн сярод туземных жыхароў забіта 4 чалавекі, ранена 15.

НОВЫ ЎРАД У ЯПОНІІ

У Японіі адбылася чарговая змена ўрада. За апошнія тры гады — гэта пятая змена кабінета. Ушоўшы ў адстаўку ўрад адмірала Іонай пратрымаўся ва ўладзе ўсяго паўгода.

Новы ўрад утворан прынцам Коноэ, які ўжо быў прэм'ерам у 1938 годзе. З іменем Коноэ звязана разгарнуўшаяся ў апошні час у Японіі кампанія за стварэнне „адзінай палітычнай партыі", якая павінна прыйсці на змену ўсім іншым палітычным партыям. Існуючыя-ж палітычныя партыі павінны, па плану арганізатараў гэтай кампаніі, „самараспусціцца". Некалькі буржуазных партый ужо абвясцілі аб сваім роспуску.

План стварэння „адзінай партыі" падтрымліваецца японскай рэакцыяй, якая бачыць у гэтым сродак узмацнення рэакцыйнай дыктатуры ўнутры краіны, а таксама сродак барацьбы супроць тых кругоў японскай буржуазіі і не партый, якія не заўсім згодны з авантурыстычнай палітыкай ваеншчыны і баяцца, што гэтая палітыка прывядзе краіну да катастрофы.

Трэба адзначыць, што іменна ваеншчына, па сутнасці справы, скінула ўрад адмірала Іонай. У Японіі прынята, што кандыдата на пост ваеннага міністра вылучае кіруючая вярхушка арміі: начальнік генеральнага штаба, генеральны інспектар ваеннага навучання і сам ваенны міністр.

Ваенны міністр у кабінеце Іоная—Хата ўшоў у адстаўку, а новага кандыдата ваенная вярхушка вылучыць не захацела. У адмірала Іонай не заставалася іншага выхаду, як уйсці ў адст[illegible]

Новы прэм'ер К[illegible] ваенны[illegible] [illegible] буржуазіі, інтарэсы якіх у прыватнасці прадстаўляе партыя Мінсейта. Гэтыя кругі бачаць, што міжнароднае становішча Японіі цяжкае, што краіна жыве ў страшэнным напружанні, што вайна ў Кітаі не відаць канца. Яны патрабуюць хутчэйшага сканчэння гэтай вайны і больш умеранай знешняй палітыкі, палепшання адносін з Англіяй і Злучанымі Штатамі Амерыкі.

Адзін час японская ваеншчына, улічваючы растучае ў народзе нездавальненне, пайшла на некаторыя ўступкі. Але зараз, у сувязі са змяніўшайся міжнароднай абстаноўкай, японская ваеншчына рашыла расправіцца з буржуазнай апазіцыяй.

Імперыялістычная вайна ў Еўропе прывяла да таго, што пазіцыі Англіі і Францыі на Далёкім Усходзе сільна аслаблі. Англія павінна эканоміць сілы, а Францыя пацярпела ў вайне паражэнне. У выніку 10 месяцаў еўрапейскай вайны ўтварылася такая „безнадзорная" маёмасць, як багацейшая калонія Галандыі—Галандская Індыя.

Японская ваеншчына марыць аб тым, як бы захапіць гэтыя багацці і замацаваць японскае панаванне ў паўднёва-ўсходняй частцы Ціхага акіяна. Але, каб ажыццявіць гэтыя імперыялістычныя замыслы, японскай ваеншчыне трэба вызваліцца ад незадаволеных элементаў унутры краіны, развязаць сабе рукі для новых авантур.

Перад новым урадам К[illegible] японская [illegible] [illegible] праграму (больш рашучыя [illegible] для спачування [illegible] Кітаі, для агрэсіі ў зоне [illegible] [illegible] Конов павінен, па [illegible] патрабаванню ваеншчыны, быць [illegible] цвёрдай [illegible] ў [illegible] [illegible] ўступкі не-задаволеным элементам буржуазіі.

Я. Нежданаў

Канвенцыя амерыканскіх краін

НЬЮ-ЙОРК, 30 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, на пленарным пасяджэнні пан-амерыканскай канферэнцыі адпагалосна адобрана Гаванская дэкларацыя і канвенцыя па пытанню аб лёсе еўрапейскіх уладанняў у Заходнім паўшар'і.

У канвенцыі гаворыцца, што падзеі ў Еўропе могуць прывесці да змянення суверэнітэта еўрапейскіх уладанняў у Заходнім паўшар'і, але амерыканскія рэспублікі не прызнаюць перадачу або намер перадаць інтарэсы і правы ў гэтых раёнах.

Амерыканскія рэспублікі маюць бясспрэчнае права ўзяць вышэйўказаныя раёны пад сваё ўпраўленне і рашыць іх лёс „у адпаведнасці з ступенню іх палітычнага і эканамічнага развіцця". Канвенцыя ўстанаўлівае, што найбольш падыходзячым рэжымам у гэтых тэрыторыях з'явіцца часовае ўпраўленне. Упраўленне можа быць створана адной або многімі амерыканскімі дзяржавамі на аснове папярэдняга пагаднення.

Працягласць упраўлення — тры гады. Яно можа быць адноўлена на больш працяглы тэрмін, але не звыш 10 год, калі будзе неабходна. Канвенцыя ўступае ў сілу пасля ўнясення ратыфікацыйных грамат у пан-амерыканскі саюз двума трэцімі амерыканскіх дзяржаў.

Канцэнтрацыя турэцкіх войск у раёне Эрзерума

Па паведамленню стамбульскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, у добра інфармаваных нейтральных кругах заяўляюць, што ў сучасны момант у раёне Эрзерума пасылаецца вялікая колькасць турэцкіх войск.

(ТАСС).

20-годдзе англійскай компартыі

ЛОНДАН, 30 ліпеня (ТАСС). 28 ліпеня ў буйнейшым зале Манчэстэра адбыўся сход, прысвечаны 20-годдзю англійскай комуністычнай партыі. На сходзе прысутнічала тры тысячы чалавек. З-за адсутнасці месца ў зал не маглі папасці сотні людзей. Было прадана 2 тысячы экземпляраў брашуры Галахера „Гісторыя англійскай компартыі". У гэты дзень у Ліверпулі [illegible] ся другі [illegible]

Высокая спартыўная фізічная дрэнаж

[illegible] Тан, у [illegible] вёсцы — [illegible] [illegible] ўсходняй абласцях у сем'ях бедняты. (ТАСС).

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

[illegible] бухгалтэрыя [illegible] гарадскога [illegible] 1 48 бухгалтэрыя [illegible] рэшткі фінансовых аддзелаў

зводкі аб размяшчэнні ўсёй сумы падпіскі

[illegible] выпусках пазыкі і вартасці аблігацый на ф. 140 на канец 1 жніўня 1940 года.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ АШЧАДКАСА.

Да ведама лячэбных устаноў.
Аптэкакіраўніцтвам атрыманы на тыжні прэпараты:

Адэналін	Фолліцулін
Гіталяй	Пантопрын
Онарын	Альбіхцін
Міоль	Дігален-Нео
Спермоцрын	Анестэзоль
Пітуітрын	Гарчычнікі
Гравідоль	Ед-Гіперол
Інсулін	Астмітол
Мамлін	Анвергол

ПРОФІЛАНЦІКУМ
(супроцьгапатрэйны сродак)
Аптэкакіраўніцтва.

БРЭСЦКАМУ ОБЛМНОГАПРОМАЎЗУ ПАТРЭБНЫ:
бухгалтары для арцеляў.
Звяртацца ў аддзел кадраў:
Пр. 17 верасня 44, тэл. 5-18.

ПРЫ МАГАЗІНЕ БЕЛМЕХГАНДЛЮ № 8 вытвараецца
СКУПКА МЯХОЎ
Адрас: Брэст, Совецкая 77.

АДКРЫТЫ ПРЫХОДНЫЯ КАСЫ БЕЛКОМУНБАНКА
на прыёму ўсіх відаў платажоў ад насельніцтва г. Брэста за комунальныя паслугі, як та: квартплата, за ацап. ачыстку, за ваду, абанэмэнтная плата за электраэнергію і радыё.
КАСЫ РАЗМЕШЧАНЫ:
1. Совецкая вул. д. № 87,
2. Пушкінская, „ „ 86,
3. Пр. 17 верасня „ 32,
4. Маскоўская вул. „ 41,
5. Вул. Жорэца, „ 28.
Просьба да ўсіх грамадзян уносіць прыналежныя платажы ў вышэйўказаныя касы.
БЕЛКОМУНБАНК
Брэсцкае абласное аддзяленне.

АРЦЕЛІ „СТАХАНАВЕЦ"
ПАТРЭБНЫ:
вопытны галоўны бухгалтар, два рахункаводы.
Звяртацца па адрасу:
Маскоўская 4[illegible]
побач з электрастанцыяй.
ПРАЎЛЕННЕ АРЦЕЛІ.

ВЫГАДНА ЗАХОЎВАЦЬ ГРОШЫ
Ў АШЧАДНАЙ КАСЕ
НА ТЭРМІНОВЫМ УКЛАДЗЕ
ПА ГЭТЫХ УКЛАДАХ
АШЧАДНАЯ КАСА
ПЛОЦІЦЬ
5% ГАДАВЫХ
Пры атрыманні тэрміновага ўкладу ранейшасці месяцаў укладчык атрымоўвае 3% гадавых, як пры звычайным укладзе.
Захоўвайце свае збяраженні на тэрміновых укладах!
Центральная Ашчадкаса № 6417, Маскоўская 20.

БРЭСЦКАЙ РЭАЛІЗАЦЫЙНАЙ БАЗЕ ЗАГОТЗЕРНО
ПАТРАБУЮЦЦА
грузчыкі і работніцы-жанчыны.
Звяртацца па адрасу:
Брэст, вул. Совецкая 24—1.

Брэсцкая рэалізацыйная база Заготзярно
[illegible] да ведама калгасаў [illegible] і аднасобнікаў, што
прыём хлеба будзе вы[illegible]
ў наступных [illegible]
1. [illegible] на вуліцы [illegible] (бывшая [illegible]
2. Дзяржаўны [illegible] на [illegible]

Брэсцкі гарадскі аддзел народнай асветы даводзіць да ведама бацькоў і апекуноў, што
прыём заяў навучаючыхся ў школы працягнут да 15 жніўня.
Бацькі і апекуны абавязаны не пазней 15 жніўня запісаць сваіх дзяцей школьнага ўзросту (ад 8 да 14 год) на навучаючыхся ў школах, у адну з школ па выбару мовы выкладання:
Рускія школы:
СШ № 2 — вул. Будаённага № 57, СШ № 3 — вул. Паўднёвай Гарадок, СШ № 5 — вул. Міцкевіча № 26, НСШ № 6 — Пушкінская № 12, СШ № 15 — Пр. 17 Верасня № 68
Беларускія школы:
НСШ № 8 — Валынка, СШ № 11 — вул. Доўгая № 11
Яўрэйскія школы:
НСШ № 4 — вул. Карла Маркса № 47, НСШ № 9 — вул. Доўгая № 65, НСШ № 10 — вул. Маскоўская № 18, НСШ № 13 — вул. Карла Маркса № 70, НСШ № 14 — вул. Доўгая № 85, СШ № 12 — Пр. 17 верасня № 84.
Польскія школы:
НСШ № 1 — вул. Дзяржынскага № 110, СШ № 7 — вул. Маякоўскага № 32.
Бацькі і апекуны, не запісаўшыя сваіх дзяцей да 15 жніўня 1940 г., будуць прыцягвацца да законнай адказнасці.
БРЭСЦКІ ГАРАНА.

Пінская дзяржаўная фельчарска-акушэрская школа аб'яўляе прыём студэнтаў
на 1940/41 навучальны год на фельчарскае і фельчарска-акушэрскае аддзяленні.
Термін навучання 3 годы.
[illegible] акушэрскую школу прымаюцца асобы за ўзросце ад 16 да 30 [illegible] 7 класаў сярэдняй школы або аднаклассную рабфак[illegible] [illegible] экстэрнаты.
[illegible] ў школы падвяргаюцца прыёмным іспытам: на рускай і белар[illegible] [illegible], палітграмоце, матэматыцы, фізіцы і хіміі.
[illegible] аб пр[illegible] выкладаецца пазрабленая ўласнаручна запісаная [illegible] [illegible] аўтобіяграфіі, даведка аб соцпаходжанні і маёмасным ст[illegible]
[illegible] іспытаў будзе аб'яўлена пазней.
[illegible] верасня 1940 года.
[illegible] атрымоўваюць кватэрную дапамогу, а таксама [illegible] [illegible] ўстаноўленую стыпендыю.
[illegible] штай або здаваць асабіста ў канцылярыю [illegible]
Пінск, Партызанская вул. № 59.
Дырэкцыя.